*Вольга Шунейка*

## Летнія матывы

Я закахалася!
Я закахалася ў лета,
У пахкасць кветак, у чароўнасць свету,
У зманлівасць палёў, лясоў і спёкі,
І ў шэпт травы лугоў далёкіх.

Гарэзліва ступлю насустрач лету.
Ў сунічны поўдзень, сонейкам сагрэты…
Я закахалася
Ці то ў цябе, ці то ў лета?..

***

Снягамі сваімі марозы ўкрыюць
Дамы і сады, саламяныя стрэхі.
Завея пад вокнамі змрочна завые…
І толькі надзея на летняе рэха,

На лета; што будзе ўсё ў парадку,
Да захаду сонца не схіліцца хутка,
Што лёс прыхаваў таямніцу-загадку,
І сонечны ранак не скончыцца смутам.

І летнія гоні расквецяцца ў краскі,
А пыл ля дарогі заўецца слупамі,
І шоргатам верас нашэпча нам казку
Пра тое, як ворагі стануць сябрамі,

Пра вернасць і гонар тых, хто йдзе на бітву,
Пра жарсць і каханне, што вядуць ад парога…
Смялей прашапчы на світанні малітву –
І ў шлях. Нас даўно ўжо чакае дарога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ